ляло 14,6% и 47% всего губернского потомственного и личного дворянства соответственно [1, с. 2, 7]. В результате с 1858 г. до 1866 г. численность дворян в Могилеве увеличилась с 1325 до 4278 человек, или на 220%. Рост числа дворян наблюдался и в других городах. Этот фактор способствовал расслоению дворянства, а также формированию рынка наемного труда и даже пауперизации городского дворянства [2, с. 205].

«Статистические таблицы Российской империи» показывают, что в 1858 году доля дворянства в белорусских губерниях оставалась самой высокой в Российской империи.

Таким образом, можно выделить 2 основных причины стремления властей сократить количество дворянства на территории Беларуси в XIX веке:

– фискальная, предусматривавший обложение подушной податью мелкого дворянства, поскольку эта социальная группа не желала исполнять свою важнейшую обязанность – служить государству;

– «охранительная», ставшее мерой предосторожности российского самодержавия против возможного растворения и ассимиляции в среде дворянства западных губерний дворян из внутренних губерний.

ЛИТЕРАТУРА

татистические таблицы Могилевской губернии за 1866 год. – Могилёв: Губ. тип., 1867. – 82 с.
юты, А. М. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст.: манаграфія / А. М. Люты. – Мінск: БДПУ, 2004. – 320 с.

УДК 947.6. «1917»

І.М. Рыжанкоў, дац., канд. гіст. навук
(БДТУ, г. Мінск)

## ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦЬ СЯЛЯНСТВА Ў КАНТЭКСЦЕ РАЗГОРТВАННЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГА РУХУ (ЧЭРВЕНЬ – ВЕРАСЕНЬ 1917 г.): ПА МАТЭРЫЯЛАХ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ

Вясной 1917 г. на неакупіраванай Беларусі распачаліся з’езды Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, Сялянскага саюза, якія заклікалі сялянства дапамагчы ўраду і рыхтавацца да Устаноўчага сходу, каб нарэшце вырашыць зямельнае пытанне і самае галоўнае ўдзельнічаць у ажыццяўленні харчовай кампаніі. Абраныя на іх выканкамы заняліся адпаведнай агітацыйнай і арганізацыйнай працай,

папаўняючы свой склад новымі дэлегатамі. У параўнанні з Сялянскім саюзам, а таксама з грамадска-палітычнымі ўстановамі рабочых і салдат – Саветамі дэпутатаў, прафесійнымі саюзамі, фабрычна-завадскімі камітэтамі – фарміраванне Саветаў сялянскіх дэпутатаў значна запавольвалася. Саветам сялянскіх дэпутатам падлягала займацца вывучэннем зямельнага пытання; падрыхтоўкай сялянства да Устаноўчага сходу; даглядам за дзейнасцю органаў улады; прадстаўніцва інтарэсаў сялянства ва ўрадавых і грамадскіх арганізацыях.

На працягу вясны – пачатку лета 1917 г. на Віцебшчыне адбылося ўтварэнне губернскага, павятовых і шэрагу валасных сялянскіх Саветаў. Важную ролю ў іх далейшай дзейнасці адыгрывалі пастановы Усерасійскага з’езда сялянскіх дэпутатаў, прынятыя з удзелам 74 дэлегатаў беларускіх губерняў. Акрамя іншых, у ліку абраных у склад Выканаўчага камітэта з’езда, былі дэлегаты Віцебшчыны: А. Я. Кусэ-Цюз (Віцебск), Дз. М. Васілеўскі (Полацк).

У некаторых губернях Беларусі, асобныя грамадска-палітычныя і нават урадавыя дзеячы ўзялі на ўзбраенне рэзалюцыю Усерасійскага сялянскага з’езда ад 25 мая па зямельным пытанні. Так, замест заспакаення сялянства і яго згуртавання вакол урадавых і грамадскіх устаноў, у шэрагу вёсак Мінскай і Магілёўскай губерняў сталі назірацца проціпраўныя дзеянні.

5 чэрвеня ў Віцебску на сходзе Арганізацыйнага камітэта Сялянскага саюза (старшыня У.М. Карпаў), было вырашана «пераіменаваць» яго ў Савет сялянскіх дэпутатаў. Нягледзячы на «ўсебаковае далучэнне да пастаноў па зямельным пытанні Усерасійскага з’езда сялянскіх дэпутатаў», якое дэкларавалі 15 чэрвеня ўдзельнікі губернскага з’езда, істотнага парушэння аграрнага становішча ў губерні не назіралася.

На Віцебшчыне, як і паўсюдна, выканкамы Саветаў займаліся выпіскай літаратуры, скліканнем сходаў, мітынгаў, ажыццяўлялі іншыя праекты, скіраваныя на асвету сялянства. Віцебскі павятовы Савет сялянскіх дэпутатаў для вяскоўцаў выпісваў газеты, набываў літаратуру. Сялянскія Саветы бралі ўдзел у арганізацыі збору ахвяраванняў.

Паказальны парадак дня Полацкага павятовага сялянскага з’езд, які адбыўся 8–9 чэрвеня. На яго з’ехалася 215 дэлегатаў. Разглядалася 11 пытанняў: даклады з месцаў, Устаноўчы сход і формы дзяржавы, вайна і дэзерцірства, зямельнае пытанне, зямельныя камітэты і прымiральныя камеры, кааперацыя, школьная і пазашкольная адукацыя, харчовае пытанне і задачы камітэтаў, нацыянальнае пытанне, вы-

бары павятовага Савета павятовага делегата на Усерасійскі з'езд сялянскіх депутатаў і прадстаўнікоў у харчовыя камітэты і іншыя пытанні. Варта адзаначыць, што з моманту свайго ўтварэння ў кіраўніцтве сялянскіх арганізацый выявілася прысутнасць партыйных работнікаў. У сваёй масе яны з'яўляліся эсэрамі, а ў адзінкавых выпадках і на асобных адрэзках часу – народнымі сацыялістамі (Віцебск). У далейшым, лінія паводзін усяго сялянскага Савета вызначалася партыйным кіраўніцтвам.

Такім чынам, сялянскія арганізацыі Віцебшчыны – суполкі Сялянскага саюза і Саветы сялянскіх дэпутатаў, як у цэлым у беларускіх губернях, узніклі па ініцыятыве грамадскіх, урадавых і партыйных дзеячаў, галоўным чынам, у мэтах перапынення аграрнага руху, дэмакратызацыі органаў улады, выканання пастаноў Часовага ўрада і яго мясцовых органаў і інш. З'яўляючыся часткай «рэвалюцыйнай дэмакратыі», сялянскія арганізацыі мусілі рухацца ў яе класавым рэчышчы. Сялянства не выяўляла павышанай зацікаўленасці да дзейнасці Саветаў, спрабавала за кошт іх вырашыць свае гаспадарчыя пытанні. Кіраўнікі Саветаў выкарыстоўвалі іх для дасягнення сваіх партыйных мэтаў, маючы на ўвазе выбары ў земствы і Устаноўчы сход.

На Віцебшчыне, аграрны рух летам 1917 г. не займеў небяспечных памераў і не пагражаў аўтарытэту «рэвалюцыйнай дэмакратыі» і бягучым рэформам. Урадавыя і грамадска-палітычныя арганізацыі здолелі на непрацяглы час пераканаць вяскоўцаў. З нарастаннем палітычнага крызіса восенню 1917 г. і выбарамі ва Устаноўчы сход палітычны расклад кардынальна змяняецца.

УДК 329.1(476) (09)

Н.М. Якуш, доц., канд. ист. наук
(БГТУ, г. Минск)

## ТУРИСТИЧЕСКОЕ ДВИЖЕНИЕ В БЕЛАРУСИ: ИСТОРИЯ И СОВРЕМЕННОСТЬ

Оформление туристического движения как частного вида путешествия начинается на белорусских землях в XIX веке в рамках его активизации в Российской империи. География туризма охватывала в основном центральные и южные регионы России. Вместе с тем можно говорить и о становлении туристической инфраструктуры Беларуси.

Реализация проектов по созданию искусственных речных путей, строительство железных дорог и прокладка дорог шоссированных в этот период стали для Беларуси настоящей транспортной революцией.